# АГМЕНЬ ЖЫВОГА СЛОВА
## 2. Паэзія

## ВЯЛІКАЯ СТРАТА

Прыблізна два гады таму, амаль зь першых дзён народзінаў «прэсы» прыхільнікаў Астроўскага, была распачата акцыя супраць ведамай нашай паэтэсы Ларысы Геніюш, пражываючай у адной з глухіх правінцыяў Чэхаславаччыны, дзе яе муж меў пасаду лекара і дзе сям'я Геніюшаў, дзякуючы сымпатыям пэўных чэскіх колаў, спадзявалася пад іхняй пратэкцыяй пазбегнуць НКВД.

Памылка сям'і Геніюшаў сталася фатальнасьцю іхняга лёсу. Не было імі ўрахавана, што «шчупальцы» НКВД знаходзяцца ня толькі ў Чэхіі. У кожнага сумленнага беларуса трывожна забілася сэрца, калі чытаў у «прэсе» Астроўскага нацкоўваньні на паэтку, дзе адкрыта цьвердзілася аб прыналежнасьці Ларысы Геніюш да прэзыдыюму Рады БНР. Якіх ад гэтага трэба было чакаць вынікаў — камэнтароў, пэўне ж, не патрэбна... Так яно і сталася... У восені 1948 г. Ларыса Геніюш была адшуканая, і ўся сям'я Геніюшаў (муж і 12 г. сынок) былі пасаджаны ў мясцовую турму, а па 2-х месяцах допыту бацькі, разлучаныя з сынам, былі вывезеныя за Урал у канцэнтрацыйныя лягеры. Для ўсіх знаючых Ларысу Геніюш асабіста (яе нязломна стойкі характар, з аднаго боку, і яе слабое фізычна здароўе) факт ссылкі ў бальшавіцкія канцэнтрацыйныя лягеры раўназначны яе фізычнай сьмерці. Гэта, безумоўна, вялікая нацыянальная страта, адна із шматлікіх найвялікшых ахвяраў бальшавіцкага тэрору. Мы можам гаварыць сяньня аб Ларысе Геніюш, як аб фізычна адышоўшай ад нас навекі вялікай патрыётцы, якая заваявала сабе адно зь першых месцаў сярод жанчынаў у нашай літаратуры. Постаць Ларысы Геніюш зіхціць перад намі ня толькі, як таланавітасьць, ня толькі, як жанчына, але як змагарка за нашую нацыянальна-вызвольнаю ідэю. Яна застанецца ўзорам крыштальнасьці, узорам адважнаснай ахвярнасьці — гераізму.

Аб гэтым усім вельмі добра ведалі нашыя тыраны. Таму яны і абышліся зь ёю гэтак, як абышліся ў падобных выпадках зь іншымі нашымі нацыянальнымі героямі: зь Ігнатоўскім, Янкам Купалам і многімі іншымі. Пасьля іх фізычнага зьнішчэньня бальшавікі намагаліся спрафанаваць іх дух, прадстаўляючы іх «бальшавікамі». Гэтак, пасьля забойства Ігнатоўскага, бальшавікі ставяць яму памятнік зь ненавіснай нябожчыку пяцікутнай зоркай, гэтак жа пасьля самагубства Купалы, як пратэсту супраць бальшавіцкай тыраніі, — ставіцца сяньня ў Менску памятнік. Гэтак жа робяцца спробы праз свае замежныя агентуры паказаць і Ларысу Геніюш «бальшавічкай» — пасьля яе закабаленьня ў канцэнтрацыйным лягэры. Чаму гэтак робіцца бальшавікамі? Паясьненьні і тут лішнія.

Нам расходзіцца тут не пра расшыфроўку бальшавіцкай тактыкі, але пра тое чыстае значэньне слова «бальшавічка», як пра гэта нагадваюць бальшавікі.

Няхай чытач прачытае ананімна-пасквільную брашуру, выданую нядаўна прыхільнікамі Астроўскага пад назовам «Хто такія крывічы?», у якой у 100% выконваецца заданьне Масквы прафанаваць ідэйную патрыётку-паэтку, каб прадставіць яе ў вачох беларускага грамадзянства сваёй пясьняркай. І потым хай прачытае ніжэй яе вершы, зь яе перажываньняў. Хай зробіць чытач выснаўкі сам — бяз нашых камэнтароў. Гэта паможа многім, сьлепа заблытаным у рады астроўшчыны, расчыніць вочы і зарэгаваць сваім сумленьнем.

«Моладзь» з свайго боку складае ўдзячнасьць прыяцелям Ларысы Геніюш за даную магчымасьць карыстаць з зборніка яшчэ не друкаваных вершаў, напісаных паэткай у часе акупацыі Чэхаславаччыны бальшавікамі.

*Ларыса Геніюш*

* * *

Бы ў жнівень сухі, смага сушыць мяне,
ўжо няма братніх сэрцаў-крыніцаў,
нават рыцар сьвяты наш на белым кане
ў маёй хаце ня сьмее спыніцца...



Нельга з вамі дзяліць сяньня сэрца адно,
Перастала бы біць, нежывое,
а бяз Вас, без братоў, мэты мне не відно,
і ня бачу шляхоў прад сабою.

Дарма рукі свае працягаю з тугой
і чакаю трывожнымі днямі.
ўжо ня скажа ніхто — мы, пясьнярка, з табой,
не сумуй над сабой і над намі.

Смагне сэрца ў грудзёх, думы ймкнуць да людзей,
дні ўміраюць бяз чынаў, бяз словаў,
што хацелі трымаць мужнай верай ў бядзе,
грэці ў сьцюжу, як поўдзень ліпнёвы.

* * *

Надходзіць зноў туманны час,
прадоньне дзён нявольных.
Магчыма, больш ня ўбачу вас,
браты мае, ніколі!

Душы людзкой ня дам скаваць
бунтарных дум узмахам.
Я прывітаньні буду слаць
Вам з кожным вольным птахам.

Няхай ня крышыць сэрцаў сум,
усім жа не устояць…
Адныя сьцяг свой данясуць,
другія ўпадуць ў боі...

Ня страшны зьдзек мне, ні прымус,
над краем толькі плачу.
Дала мне Маці-Беларусь,
відаць, такую ўдачу…

Заўсёды у мроях з Вамі, ў снах,
жыць буду ці загіну —
п'ю чару горычы да дна
за Вас і за Краіну.

* * *

Калі вецер асеньні часамі
пачне біцца аб цьвёрды бэтон,
недзе рвацца буйнымі крыламі —
раскалышыцца сэрца, як звон.

…Быццам едзеш дамоў па дарозе,
коні звонка капытамі тнуць,
бляды месяц, апёршысь на розе,
сьвеціць тухлай лятарняй у цьму.

Толькі пырскаюць борздыя коні
ды чужое міргае акно,
сумны вецер расказвае стогнам,
што сям'і ўжо няма тут даўно.

Быццам птушкі далёка у вырай
адлятаюць прад сівай зімой, —
на прасторы ліхое Сібіры
завязьлі іх усіх грамадой.

Але птушкі вясною свабодна
Прылятуць яшчэ ў белы наш сад,
толькі тыя, зь Сібіры халоднай,
ўжо ня вернуцца ў вёскі назад...

*№ 12, 1949 г.*

## ЧУЖЫНА

Эх, ліхая чужына... Ня выжыў бы тут,
каб ўспамін родных ніў не лялеяў,
каб ня сьніўся начамі пакінуты кут
і душы не кунежыў надзеяй.

За ўсю радасьць тваю лепша дома нуда,
ў нашым полі глухім адзінота,
там найродную песьню булькоча вада,
каня тужыць адна над балотам.

Там ад траваў і красак на межах гусьцей,
і пад буйныя ветру павевы
весялей там шапоча густое трысьце,
прыгажэй нагінаюцца дрэвы.



З родных сёлаў і зь ніў звонка-звонка здалёк
песьня к сэрцу тугой далятае,
вецер, быццам кудзелю у белы клубок,
павуціньне ў палёх навівае.

А ты каменным сэрцам так срога маўчыш, —
ды і сэрца, магчыма, ня маеш, —
не табе зразумець, чаму думы ўначы
вечна рвуцца далей небакраю.

## РАНІЦА

Раньне зьвейнай аснована ймглою,
такой лёгкай, як быццам бы ўздох…
Крывічанка нат зграбнай рукою
так палотнаў ня тчэ на краснох!

Нат тым лонам сваім залацістым
не патрапіць так лёгка снаваць,
як той вэлюм празорна-імглісты,
што авейваў кругом сенажаць…

Ўстае сонца, румянае сонца,
твар ў вазёрнай памыла вадзе,
ды глядзіць, як дзяцюк, праз аконца,
сінявокі, разбуджаны дзень.

Раса сыплецца бляскам на краскі,
зазьвінелі на межах званкі;
ў вадказ словы дасьпелае ласкі
шле ім колас зярніста-стрункі.

Гэта раньне, румянае раньне!
Згорне вецер імглу на палёх,
блісьне сонца, як тое каханьне,
прытаіўшысь ў дзявочых вачох!

## КРАЮ МОЙ…

Краю мой родны, краю мой мілы,
цудны, узорны, ад ніў залаты,

хто цябе ўквеціў пушыстай калінай,
краскамі, лесам засеяў густым?

Пушчы, палеткі, лугі, сенажаці,
быстрыя рэкі, прасторы азёр, —
нехта рассыпаў вялікім багацьцем
вечныя скарбы ў цудоўны узор.

Калі табе золатам сонца разлітым
магутныя грудзі асыпле кругом,
а неба атуліць туманам-блакітам,
быццам-бы анял празорным крылом,

і вецер бяроз тваіх косы даўгія
расчэша, рассыпле па белых камлёх,
а грушы красуні страсе сьнегавыя,
сьвет белы пасее на зелень палёў,

а буйныя травы нагне, то падыме,
зазвоніць аб лісьце задуманых дрэў,
акордамі ўдарыць, як май, маладымі,
пад Нёмна вясновы бурлівы напеў, —

дык радасьцю, шчасьцем душа замірае
і хочацца сэрцам, рукамі абняць
свой край наймілейшы, аквечаны маем,
дзе краскі, дзе Нёману хвалі зьвіняць.

Дзе птушка у неба высокім палётам
маніць да сонца ў блакіт за сабой,
ўзыходзіць, мацнее з сялянскага поту
зярнё, вырастае ў калосьсе вясной.

Краю мой родны, краю мой мілы,
калыска дум раньніх, вясёлкавых дзён,
краю дзядоўскіх курганных магілаў, —
ты сэрцу так мілы, як міла жыцьцё.

Сьніцца ты будзеш, ўсё клікаць з чужыны,
маніць ў свае сёлы, да хаты старой,
пахучым палеткам буйной канюшыны,
дзявочаю песьняй спавітай тугой.

Чало плуг жыцьця, можа, ў боразны зрэжа,
мо голаву іней пакрые гадоў, —



у сэрцы ж ня зьвянуць зялёныя межы,
туга не аслабне да родных кутоў.

*№ 11, 1949 г.*

## НЕ МІНАЙ

Не мінай вясной упойнай
дыванам расьцьвіўшых гоняў —
адплыве вясна з вадою,
дзён мінулых не дагоніш.

Не лякайся віхру лёту,
калі сэрца п'яніць ўздымам —
пасьля меціміш ахвоту,
але крыльляў не падымеш.

Не нацягвай струн замоцна,
бо іначай струны трэснуць,
як глыбокі жаль замоўкне —
не пачуеш болей песьняў.

*№ 12, 1949 г.*

## НОВЫ ГОД

Новы Год ідзе крокам бадзёрым,
крокам звонкім, як сам, маладым,
расьсьцілае надзеі узорныя,
гоіць крыўдаў і ранаў сьляды.

Ідзе стуль, дзе ў завеяных хатах
вас чакае сям'я за сталом,
каб са згубленым сынам ці братам
падзяліцца сямейным цяплом.

Ідзе стуль, вецер дзе у лазінах
па-за гурбамі сьнегу заціх;
на гасьцінцах дзе скрып палазіны
замірае у далях лясных.

Ідзе зь сьнегам засланых загонаў,
Нёман сьпіць дзе пад лёду карой.
Хай жа ў нашую чарку зазвоніць
на чужыне ды братняй рукой!

Хай нясе успаміны аб сёлах,
што у белай задуме ляжаць.
Прывітайма ж яго мы вясёла,
каб ніводзін ня сьмеў сумаваць!

Новы Год ідзе крокам бадзёрым,
як заўсёды — зь бярэмам надзей.
Мо вясною палямі узорнымі
ў родны, вольны наш Край завядзе.

## КНЯЗЬ УСЯСЛАЎ ЧАРАДЗЕЙ

Серп-месяц на небе між хмараў брыдзе
срэдзь семені зор адзінокі;
вось, быццам гуляе шчупак па вадзе,
ныраючы ў хвалях глыбокіх.

Арол, гэтак ўзьбіўшысь пад воблакаў сінь,
магутны сваёй адзінотай,
аб шэрай нізіне забудзе зусім,
паднебным упіўшыся лётам.

У кіеўскім замку Ўсяслаў Чарадзей
змагаецца з духам бурлівым
і ўздох гладзінёю калыша грудзей,
бы вецер дасьпелаю нівай.

Ён думаў ня можа цяжкіх ўгаманіць,
тугі сваёй ўцешыць па краю,
і гордае князева сэрца баліць,
ды сон ад вачэй адлятае.

Зь вязьніцы сумнай на княжы пасад
яго ўвесь Кіеў паклікаў —
ён ўсё ж з панаваньня і волі ня рад —
ня хоча той чэсьці вялікай.

Мілейшыя сэрцу парогі сваі,
пасад свой і тыя дружыны,
зь якімі хадзіў у цяжкія баі,
баронячы межаў Айчыны.



Мілейшы той Полацкі край дарагі
і пушчы з пахучай жывіцай...
Нядаўна Нямігі ціхой берагі
крывёю зьліліся крывіцкай.

Там мужных ваяраў ляжаць чалясы —
хто ж гоіць крывіцкія раны
тады, калі князь, першы Полацку сын,
чужацкія носіць кайданы?

І хоць над Нямігу склака груганоў
ня раз ўжо зьляталася ў госьці —
ўсё ж князева сэрца начамі дамоў
ўсё клічуць байцоў сваіх косьці.

Ўжо цемень радзее, ўжо зоркі ўцяклі
і зьнік бляды месяц за імі —
князь ўсё яшчэ чуе зямлі свае кліч,
ды з думамі б'ецца цяжкімі.

Ён чуе, як рвецца Дзьвіна ў берагох,
бароў сваіх гоман адвечны,
ён чуе, як ў полацкіх гордых мурох
шуміць ўсхваляванае веча.

Цьвіце ужо неба, як тыя ляны,
і дзень ўжо над Кіевам сіні —
князь слухае сэрцам — б'юць, звоняць званы
у полацкай роднай сьвятыні.

Нядарам казалі, што князь — чарадзей...
Хто ж, духам прабіўшы прасторы,
у Кіеве чуў бы, як звон свой гудзе,
хто б знаў, што ён сэрцу гавора?

Вялікае сэрца мець трэба ў грудзёх
і духа магутныя чары,
каб чуць, як у полацкіх гордых мурох
у звон сьвятой Софіі ўдараць.

Агнём пальмяным трэ край свой кахаць,
трэ вырасьці зь ніваў, загонаў,
каб славу, багацьце, ўсё кінуць, аддаць,
за кліч свайго роднага звону...

*№ 15, 1949 г.*

*Алесь Салавей*

* * *

А прайшоў я ці мала дарог у сьвеце —
мне было не да стомы ног.
Дзе вы, золку агні? Па начох ня сьпеце:
за сьпіной — вялікомы лёх.

Асьляпляйце яго — і, як сон, з далінаў
злыне чорная сажа дзён.
А блакіт?.. — «Воч маіх ты ў палон ня кінуў», —
пра цябе так хай кажа ён.

*1945*
*№ 8, 1949 г.*

## ЗДАЛОСЯ...

Здалося — змоўк навекі звон,
пайшоўшы на скананьне.
Ніхто ня чуў, як плакаў ён
у топкай вечнай твані.

Ніхто ня знаў, як звону гнеў
зьбіраўся ў дужы гоман...
Звон страпянуўся, зазьвінеў,
над сьветам грымнуў громам.

Зь сівых глыбінаў даўніны
і з ланцугоў палону
пачулі вольнасьці сыны
кліч праўды і праклёну.

*№ 10, 1949 г.*



*Уладзімер Дудзіцкі*

## КАБ ХОЦЬ РАЗ УСЬМІХНУЛАСЯ ШЧАСЬЦЕ

Каб ня рукі, а крылы магутныя меў, —
узмахнуў бы я крыламі вышай,
у надзем'е крутое, як сэрцу на ўме,
дзе блакіт неба зорамі вышыт,

узьляцеў бы і гора тугое зямлі
у бяздоньне, раскрытае насьцеж,
паміж хмараў набраклых у песьнях разьліў,
каб хоць раз усьміхнулася шчасьце;

каб у грудзі — да сэрца — з павевам вясны
уліліся гарачыя радасьці хвалі,
каб мае расьцьвілі ўсе найлепшыя сны,
што, прысьніўшыся, сьпяць, як і спалі;

ды ня крылы, а цела нямыя кускі —
рукі — цяжка узьняць і пакратаць...
І ня цьветам, а пылам жалезнай лускі
асыпаюць душу марыінскія краты.

*№ 12, 1949 г.*

## МОЛАДЗІ

Дарма што сплямлены наш сад,
крывёй абліт журботны жнівень,
шуміць пад зорамі краса
на сакавітай роднай ніве;

дарма што водблескі крыві
крывавяць край блакітны неба, —
працуй, змагайся і жыві:
змаганьне пільна сяньня трэба!

Адзін на жвір грудзьмі падзе,
другі народзіцца і стане;
і сьлед прыцішаных падзей
сьвятлом зары асьвеціць раньне.

Насустрач разам выйдзем мы
і зь першай сонечнай усьмешкай

спалошчам спадчыну чумы
і друз аджытага на сьцежках.

І расшуміцца сьпелы сад
і золатам спавіты жнівень...
Расьці, юнацкая краса,
на сакавітай роднай ніве!

## З ЦЫКЛЮ «ЦЕНІ СЬМЕРЦІ»

Ты наровіш, пазнаў я, употай паўзьці
за плячыма, туляцца і стынуць,
упівацца у цела маё да касьці,
ценем чорным схіляцца ля тыну.

На паўкроку цікуеш пры сонцы хаду,
а па сонцы — даўкімі рукамі
у касьцістай істоце спустошаных дум
точыш, лашчыш абветраны камень...

Выгінаешся, кленчыш прад воблікам дзён,
перад першай выгоднай ахвярай...
Ненасытны пагляд твой, згібеньне, відзён
пры сьвятле і у збоішчы хмараў.

Адступіся, касьцісты, жахлівы прывід, —
цень сьмяротны сьмяротнага духу!
Не скарыцца жывое на сьцежках крыві
перад сілаю грэшніцкай скрухі.

Ты наровіш, пазнаў я, употай паўзьці,
ценем чорным схіляешся коса...
Бой крыві ў маіх жылах ня счах і ня сьціх,
голас песьні расьце да нябёсаў...

* * *

Не сыходзяцца горы з горамі,
не зблiжаюцца і узвышшы.
Нават думкам — цяжкім і змораным —
на спатканьне ніхто ня выйшаў.



Адзінокія блудзяць сьцежкамі
спадзяваньні пад млосным небам,
І ня хоча цьвісьці усьмешкаю
неспакойны штодзённы небыт;

зь весяласьцю чужой ня мірыцца,
не ступае сумесна кроку, —
на журботнай у песьнях лірыцы
пакідае свой сьлед глыбокі.

Чым упартасьць такую выраку
за марамі — на горнай высьпе?
Кажуць, голас ліхога выраку
над маёй галавою высьпеў.

Бо ня сходзяцца горы з горамі,
не зблiжаюцца і узвышшы.
Нават думкам — цяжкім і змораным —
на спатканьне ніхто ня выйшаў.

*№ 15, 1949 г.*

*Андрэй Зязюля*

## ЗА ШТО?

Ці не за тое, дзеці ночы,
Вы страшны гоман паднялі,
Што праўда ўсім вам коле ў вочы,
Што праўду вы запрадалі?..

Не выклікайце ж воўка зь лесу,
Ня шырце фальшу між людзей,
Бо прыйдзе час сарваць завесу
І ўбачыць сьвет ваш подлы дзей.

Абсядзьце ж, лепей не чапайце
Спакойнай працы грамадзкой,
І ямы рыць не пачынайце,
Бо самі будзеце у ёй!..

*№ 7, 1949 г.*

*Алесь Змагар*

## ЮНАКУ

Незваротнай плыняй
Праплываюць годы.
Будзь жа верным сынам
Ты свайму народу!

Ў горы не згінайся
Пад цяжкім прымусам!
З гонарам трымайся
Імя беларуса.

Бо і наш час прыйдзе,
Й нам засьвеціць сонца:
Прамень Волі ўзыйдзе
Ясным валаконцам.

Шчасьця дні паймкнуцца,
Й з дальняе дарогі
Мусім мы вярнуцца
Ў Край свой зь перамогай.

*№ 21, 1951 г.*

## ХУТКА НАДЫЙДЗЕ ПАРА!

Восень спускаецца шэраю хмараю,
Вецер у стрэхі гудзе;
Сум неадчэпнаю цяжкаю мараю
Поўніць дакучлівы дзень.

Прагна імкнецца душа супакоіцца,
Рвецца з кайданаў, з багны;
Ды на чужыне чужая ваколіца,
Людзі — чужыя сыны.

Тут не пачуць ні спагады слоў ласкавых,
Ні цеплыні, ні пяшчот.
Зоркі і тыя ня йскрацца над краскамі,
Не усьміхнецца завод.



Ногі крывавяцца сьцежкай жабрачаю;
У думках — гаротны наш Край,
Маткі няшчасныя бавяцца плачамі,
У сэрцы нястрымны адчай.

Дома народ наш пакутуе ў роспачы
Рвецца з багны, з кайданоў.
Гойсаюць каты крывавыя поначы,
Нішчаць краіны сыноў.

Ды ўжо нядоўга народ будзе ў путах,
Хутка надыйдзе пара.
Дымам разьвеюцца ворагі лютыя,
Сьветлая ўзыйдзе зара.

*№ 19, 1950 г.*

## ЗА МАЦІ-БЕЛАРУСЬ

Збалелыя грудзі
Занылі ад болю,
Сьлязьмі затуманены вочы,
Варожыя людзі,
Знішчаючы волю,
Пануюць над Краем, як хочуць.

Над ціхаю кручай
Пад ліпай шырокай,
Дзе зь мілай сядзеў аж да рана,
Праз словы гаручы
Кудысьці далёка
З журбой пазірае кахана.

Зь вязьніцы сурова
З-за крат выглядаю.
Пяюць салаўі напрадвесьні.
За родную мову,
За Край свой страдаю,
За сумныя, любыя песні.

І лёгкія мары
Лятуць аж да зораў
Пад сіні блакіт Беларусі.
Ніякія кары,

Ніякае гора
Зрачыся Радзімы ня змусіць.

*Слуцкая вязьніца, 1921 г.*

## Я З ТАБОЮ ПОПЛЕЧ

Паплыла за хваляй хваля,
Аж пярэсьціцца рака.
Я з табою поплеч, Валя,
Не дрыжыць твая рука.

Човен гойдаецца злосна,
За прыбоем б'е прыбой...
І снуюцца жыцьця кросны
То з надзеяй, то з журбой.

Пазіраю табе ў вочы —
У блакітну неба сінь,
І лягчэй па межах крочыць,
І ня страшна далячынь.

Перад намі яснай зоркай
Кветка-Папараць мігціць…
Мроя ймчыцца за узгоркі,
Мроя ў родны Край ляціць...

*1949, Францыя*

## КАЛЯДЫ

Зьвініць марозны ясны дзень,
Сышоў на ніз лясных галінак:
Замітусіўся сумны цень,
Ахутаў цемраю нізіны.
Жанчыны сена для куцьці
Прынесьлі, ў рэшата паклалі.
Каб шчасьце трапіла ў жыцьці,
Дзядоў за стол к сабе зазвалі.
Прыйшлі нябожчыкі-дзяды,
Прыйшлі здалёк, садзяцца ў покуць
І сьвята слаўнай Каляды
Адсьвяткаваць з усімі хочуць.



Паважна моляцца бацькі.
Са страў вачэй ня зводзяць дзеці.
Бо хіба можна дзе знайсьці
Такія стравы ва ўсім сьвеце?
Бягуць дзяўчаткі варажыць
Ячменем, воскам на талерцы.
Каму й за кім належыць жыць?
Хто прыйдзе поўначы ў люстэрцы?
А пад вакенцам са зьвяздой,
З вэртэпам ходзяць з хаткі ў хатку,
Зь мядзьведзем, жоравам, казой —
Сьвяткуюць родныя Калядкі.

*Скрыбава, 1944*

## ЗАВІРУХА

Бура злосна завывае,
Вецер жаласна гудзе,
Сьнег дарогі замятае,
Белу вопратку прадзе.

Ўсюды ў полі, на разлогах,
Каля лесу, ля стагоў,
На лугох і на дарогах
Коўдры белыя сьнягоў.

Мільгацяць вакол пушынкі,
Засыпаюць вочы, твар,
Асьняжаюць дрэў галінкі,
Беляць чыста, як маляр.

Бура злосна завывае,
Вецер жаласна гудзе,
Сьнег дарогі замятае,
Белу вопратку прадзе.

*Радашкавічы, 1944*

## ВЯСНА

Вышэй падымаецца яркае сонца,
Праменьнямі песьціцца ў твар,

Іскрыцца і вабіць дзяцей праз ваконца,
Заве на шырокі абшар.

Заве паглядзець, як пралеска ў цянёчку,
Аджыўшы ад зімняга сну,
Ізноў паказала блакітнае вочка —
Вітае красуню-вясну.

Заве на дываны зялёнага поля
Паслухаць, як жаўранка сьпеў
Высока-высока, дзе сонца, дзе воля,
Аб сьветлай вясьне зазьвінеў.

Вышэй падымаецца яснае сонца,
Праменьнямі песьціцца ў твар,
Іскрыцца і вабіць дзяцей праз ваконца,
Заве ў неабсяжны абшар.

*№ 17, 1950 г.*

## ЮНАЧКА

Ты у дзіўным харастве стаяла перад намі.
Так велічны, так горды быў твой гнеў.
Ад роспачы, тугі сьціскала кулакамі,
Ў вачох агонь маланкава зіхцеў.

І раптам, угару высока узьняўшы рукі,
Сумотны ўдалеч кінула пагляд:
Там… дзесьці у бару, сярод нясьцерпнай мукі
Гібеюць бацька, маці, родны брат.

І позірк той, як сымбаль перад цэлым сьветам,
Паказваў шлях да новых перамог.
І на сьцягох уваскрасалі запаветна
Сьвятыя словы: Бацькаўшчына й Бог.

*№ 7, 1949 г.*

## ДЗЕНЬ 25 САКАВІКА

Радзіўся Ты у Менску Беларускім,
Пажарам Край дыміўся у вагні.



Наўкол чужынцы: немец, лях і рускі
Тапталі лепшыя палеткі нашых ніў.

Народ стагнаў, ўздымаў угору рукі,
Лавіў сьвятла далёкага прамень.
Быў цяжкі час. Сярод нясьцерпнай мукі
Зьявіўся Ты, прыгожы, сьветлы Дзень.

Цудоўнай зоркай ўзьняўшыся высока,
Народу шлях да волі асьвяціў.
І зашасьцелі казкаю асокі,
Мінулай славай лес загаманіў.

І Край ажыў. Народ паймкнуўся к сьвету.
Ў вачох крынічыць радасьці струмень.
І нашых продкаў слаўных запаветы
Ўваскросьлі ў гэты незабыты Дзень.

Вялікі Дзень! Нічым Цябе ня сьцерці,
Стагодзьдзям нат Цябе не пераж ыць!
Вякі мінуць, а Ты ў народным сэрцы
У песьнях-былях будзеш вечна жыць.

*№ 9, 1949 г.*

## У БІТВУ РВУЦЦА СЬМЕЛА СЛУЦКІЯ ПАЛКІ

Над зямлёю Слуцкай стараны каханай
Падымаўся ўгору жудасны віхор.
Наляцела хмарай, дзесьці захаванай,
Войска азіятаў на наш шыр-прастор.

Але ўжо ня згодзен Беларус гнуць сьпіну.
Досыць працярпеў ён шмат гадоў палон!
Паўстае ён сьмела за сваю Краіну,
За абліты потам дарагі загон.

У вачах бліскучых гонар і адвага.
Хай грымяць гарматы! Надышлі вякі,
Калі к шчасьцю, волі безупыннай смагай
Ў бітву рвуцца сьмела слуцкія палкі.

*Слуцак, лістапад 1920 г.*
*№ 5, 1948 г.*

*Тодар Лебяда*

## ЗВАЖАЙ

Мы моладзь, мы зроджаны ў буру, пажары,
Нам ясны дарогі-пуці,
І тое, што ўчора здавалася марай —
Мы творым сягоньня ў жыцьці.

Няхай нас ня страшаць чырвоныя каты,
Бо мы на крывавы тэрор
Паўстанем сьцяною — хлапцы і дзяўчаты,
Каб даць ім належны адпор.

Дарма сяньня каты скрыгочуць зубамі,
Ня згасіць ім нашу зару.
Мы болей ня будзем ніколі рабамі,
Бо кліч наш — Жыве Беларусь!

*Францішак Аляхновіч*

## МОЙ РОДНЫ КРАЙ

Мой Родны Край! Старонка сумная,
За што Цябе любіць? Калі б спытаўся хто, —
Што адказаць, ня ведаў сам бы я,
Скуль гэтая любоў? Дзеля чаго, за што?

Каменьне вострае крывава раніць ногі,
Дрыжыць ў паветры плач старых бяроз;
Хаця мне жудасна, я не сыйду з дарогі,
Ня кіну Край, дзе я радзіўся, рос…

Старонка Родная, за што Цябе любіці
І на ахвяру ўсё жыцьцё Табе даваць?
Ці ж не ляпей пад іншым небам жыці,
Забыць Цябе, пакінуць, Родна Маць?..

Там, дзе сады цьвітуць бяз мала праз год цэлы,
Там неба сіняе, нямашака там хмар;



Людзкія там здароўем поўны целы,
І адымае дух мастацтва дзіўны чар.

Там Вінчы, Рафаэль, Анжэла, Тыцыян,
Глядзяць манумэнты там горда ў неба высь.
У нас забыты ў полі дзесь курган
Ды ля дарогі дрэмле стары, падгнілы крыж.

Твой, Беларусь, пачаўся Рэнэсанс цяпер,
Хто ведае, што створыць Твой народ?!.
Хоць красак там няшмат, хоць Край, як доля, шэр,
Зварухнуўшыся раз, дух пойдзе ўжо ўпярод.

І хоць з-за воблакаў пахмурна сьвеціць сонца,
І шчасьця, радасьці ня знойдзеш тут нідзе, —
Загляне доля шчэ і ў нашае ваконца,
І кветка-папараць яшчэ нам зацьвіце!

*№ 9, 1949 г.*

*У. Сноп*

## СУМНА МНЕ, БОЖА!

Сумна мне, Божа, на чужой старонцы
Не знайсьці сэрцу хвораму спагады.
Праходзяць людзі — бачу праз ваконца,
Іх не кранаюць чужыя пагляды.

Праходзяць будні мае адзінока,
Шэрыя будні, — пахмурна, бяз сонца;
Дарма шукаю на небе навокал
Ветлага бляску ў чужой старонцы.

Сумна мне, Божа, смутку не разьвею,
Ілюзійнай мары і шчасьця зямнога.
Знаю, што пройдзе жыцьцё, бы завея,
Бы сьнег растае пад сонечным жогам.

Дарэмна дух мой шукае у высі
Нейкай таёмнай, нязнанай надзеі,

Бо між людзкога, зямнога узвышша
Я знаю, смутку свайго не разьвею.

*№ 23, 1951 г.*

*Янка Палонны*

## НЕ КУВАЙ, ЗЯЗЮЛЯ

Не кувай, зязюля, сумна ў родным гаі,
не прароч матулі, калі прыйдзе сын, —
ён ужо ня прыйдзе, сьпіць у дамавіне,
на чужых загонах, між чужых калін.

За яго труною не ішлі суседзі,
не званіў з званіцы прытрухлелай звон,
не гублялі сьлёзаў сёстры над магілай,
не пяялі песьняў на жалобны тон.

Ён адзін далёка зьлёг пад градам куляў,
на чужой зямельцы кроў сваю праліў
за чужыя справы, за жывыя раны,
што здаўна на сэрцы вораг палажыў.

Не кувай, зязюля, сумна ў родным гаі,
ня прароч матулі, калі прыйдзе сын, —
ён ужо ня прыйдзе, бо ў зямлі далёкай
сьпіць з тугою па Краі між чужых калін.

*№ 10, 1949 г.*